ЛІСТ АД ПАЭТА-ЗЕМЛЯКА

# Хоцімскі храм

***Добры дзень, дарагія мае землякі!***

***Пасылаю вам верш, які не мог не напісаць у сувязі з вялікай нагодай – узнагароджаннем настаяцеля Хоцімскага Свята-Троіцкага храма. Спадзяюся, што вы яго надрукуеце. Перадаю шчырае вітанне ўсім, хто яшчэ ведае і помніць мяне на роднай зямлі.***

***Ваш Пятро ПРЫХОДЗЬКА.***

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь нядаўна была прысуджана прэмія “За духоўнае адраджэнне” 2002 года сярод іншых грамадскіх дзеячоў і настаяцелю Свята-Троіцкага храма ў г.п. Хоцімск Магілёўскай вобласці – Бадзічу Алексею Пятровічу (архімандрыту Кірылу).

Гэта вестка мне асабіста прынесла вялікую радасць, як і ўсім маім землякам. З Хоцімскім святым храмам звязаны жыццёвы лёс усіх нас. Мая вёска Альшоў, напрыклад, знаходзіцца ў прыгарадзе гарадскога пасёлка. Сюды ўсе аднасяльчане хадзілі маліцца Усявышняму ў святы і будні. У гэты храм мяне родная мама Марыя разам з дзедам Яхімам прыносілі перахрысціць святым крыжам адразу пасля нараджэння. Затым у дзяцячым і юнацкім узросце я прыходзіў часта сюды сам прычасціцца перад Божай іконай. Не мог я тады і ўявіць, што адбудзецца тут на пачатку трыццатых гадоў: царкву малую ў Хоцімску разбурылі зусім, а з храма знялі крыжы і купалы, пакінулі толькі сцены, арганізавалі ў іх так званы раённы Дом культуры. Ну і за гэта дзякуй, што далі сценам уцалець: яны прастаялі доўгія гады, не спаленыя нават вогнішчамі спустошальнай вайны...

Прайшлі гады. Усё стала вяртацца на сваё месца. І вось на шчасце і радаць усім нам настаяцель архімандрыт Кірыл па сваёй ініцыятыве, пры дапамозе ўсіх землякоў роднай Хоцімшчыны аднавілі ў гарадскім пасёлку святы Свята-Троіцкі храм. Зноў сюды натоўпамі пайшлі веруючыя людзі памаліцца Усявышняму за выратаванне сваіх душ ад розных бедаў і нягодаў. Зноў загучалі званы непакаронай святыні.

Вось чаму я не мог не адгукнуцца на гэту падзею і не напісаць верша, прысвечанага ёй, як гістарычнай, хвалюючай падзеі.

*Храм гэты працай людзі*
*аднаўлялі,*
*У яго ўсе душы ўкладвалі свае.*
*І Бесядзь збоч нібыта*
*свае хвалі*
*Улівае ў звон, што голас*
*падае.*
*А шчэ нядаўна, у былым*
*стагоддзі,*
*Калі блюзнёрству*
*не было мяжы,*
*У раз`юшанай, шалёнай*
*непагодзе*
*З яго здымалі купалы, крыжы*
*Якойсьці нехрысты*
*жадалі змены,*
*І над крыжамі верх свой узялі.*
*Ды, дзякуй Богу, узняліся*
*сцены*
*Ад храма на радзімічаў зямлі.*
*О колькі год гублялі*
*дрэвы лісце,*
*Галінкі ж выраслі зноў і зноў.*
*А старажытны род,*
*як і калісьці,*
*У зямлі не страчваў*
*мужных каранёў.*
*Крыжамі Свята-Троіцкага*
*храма*
*Быў шлях азораны ўсёй*
*стараны*
*Мяне хрысціць сюды*
*насіла мама,*
*Як клікалі да ютрані званы.*
*У гэтым храме пад*
*праменнем свечак*
*І мне імя тут дадзена было.*
*Над сцежкаю жыццёвую*
*навечна*
*З нябёсаў загарэлася*
*святло.*
*Матуля ў Бога мне жыцця*
*прасіла,*
*Лоб акрапляючы святой*
*вадой,*
*Каб не знікала ў сэрцы*
*мужнасць, сіла*
*У змаганні ні перад якой*
*бядой.*
*На дрэвах разрасталася*
*зноў вецце*
*Крухі ахутваючы лысых пнёў.*
*Хоць і прайшло над храмам*
*ліхалецце,*
*Ды не кранула вечных*
*каранёў.*
*Між дрэў, якія сонца*
*азарыла,*
*Муры зноў ажыўляцца*
*пачалі.*
*І вось да настаяцеля Кірыла*
*Пайшлі ўсе людзі па*
*сваёй зямлі.*
*І ён удзячны ім за дапамогу,*
*Каб найхутчэй узняць*
*з нябыту храм,*
*Які да сонца асвятліў*
*дарогу*
*Усім землякам, усёй*
*зямлі дарам.*
*Дык хай пад залатымі*
*купаламі*
*Расчыніць дзверы храм*
*шырэй на ўсход.*
*Багата ж, кажуць,*
*хата не кутамі,*
*А хлебам тым,*
*што здабываў народ.*

***12 студзеня 2003 года.***
**Пятро ПРЫХОДЗЬКА.**

**Прыходзька, П. Хоцімскі храм** : верш / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 2003. — 22 студзеня. — С. 1.